Усе пералічаныя асаблівасці народна-інструментальнай культуры пісьмовай традыцыі абумоўліваюць асноўныя накірункі, аспекты і праблемы даследавання аб'екта.

Таірава Л.С.,
дацэнт

## СУЧАСНАЕ СТАНОВІШЧА НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАГА ВЫКАНАННЯ Ў БЕЛАРУСІ

Многія дзеячы культуры зараз клапоцяцца аб адраджэнні нашай беларускай спадчыны. Вельмі плённа працуюць фалькларысты. Гэта важная і патрэбная справа ўжо зараз мае свае плённыя вынікі. Але непакоіць тое, што менавіта толькі фальклор зараз лічыцца галоўным накірункам у адраджэнні нацыянальнай культуры і толькі яму аддаюць перавагу і аказваюць падтрымку нашы кіруючыя органы ў галіне культуры. А між тым у нас існуюць іншыя выдатныя, непаўторныя традыцыі, напрыклад ігры на народных інструментах, закладзеныя Г.Жыхаравым, І.Жыновічам, якія могуць быць страчаны ў выніку аднабаковага накірунку нашай культурнай палітыкі.

Нам ёсць чым ганарыцца. Дастаткова прыгадаць вынікі мінулых конкурсаў выканаўцаў на народных інструментах імя І.Жыновіча. Першы конкурс, які адбыўся ў канцы 1987 г., падарыў нам такія імёны, як І.Яраш, І.Шэлег (І прэмія, баян), Л.Рыдлёўская, Н.Кава-лёўская (І прэмія, цымбалы). У той жа час гэта быў не толькі конкурс асобных выканаўцаў, але і конкурс жанраў, дзе самымі яскравымі былі цымбалы. Выканаў-цы на цымбалах уразілі сваім высокім майстэрствам, адметнай культурай выканання, даказаўшы, што ім даступны самы разнастайны і найскладанейшы рэпертуар айчыннай і заходнееўрапейскай музыкі. Сярод выканаўцаў на струнных інструментах гэта аказалася адзіная спецыяльнасць, дзе былі рэалізаваны ўсе прызавыя месцы.

На жаль, выканаўцы іншых спецыяльнасцей не здолелі выкарыстаць існуючыя мастацкія магчымасці. Сярод дамрыстаў і балаласчнікаў першае месца нікому не было прысуджана. Другое занялі Ю.Валіцкі (домра), Г.Бранкоўскі, С.Рэгель (балалайка), а сярод гітарыстаў толькі Я.Грыдзюшкі ўдалося заваяваць 3 месца. І ўсё ж гэты першы конкурс з'явіўся своеасаблівай кропкай адліку, магутнейшым стымулюючым імпульсам выканальніцкага майстэрства ўсіх «народнікаў» ва ўсіх жанрах.

Другі конкурс вывеў многіх удзельнікаў першага конкурсу на новую майстэрскую і якасную арбіту. Некаторым з іх удалося значна палепшыць былыя вынікі. Так, уладальніца другой прэміі першага конкурсу сярод цымбалістаў В.Мішула стала пераможцай на другім конкурсе.

На жаль, другі конкурс з'явіўся адлюстраваннем некаторых негатыўных тэндэнцый у нашым музычным жыцці, такіх, напрыклад, як заняпад нашай айчыннай балаласчнай школы. Нягледзячы на лідэрства В.Ляпічынскага (2 прэмія) і С.Носава (3 прэмія), большасць балаласчнікаў паказалі на конкурсе вельмі сціплыя магчымасці.

Нельга не адзначыць і тое, што Беларускі універсітэт культуры аказаўся па-за межамі гэтых падзей. Ніхто з выканаўцаў нашага універсітэта не прымаў удзел у названых конкурсах, і гэта пры тым, што ў нас ёсць добрыя выкладчыкі і выхаванцы, якія б маглі дастойна трымаць марку Беларускага універсітэта культуры.

Конкурс — гэта не толькі значная падзея ў музычным жыцці краіны, але і своеасаблівы паказчык узроўню беларускага народна-інструментальнага выканання. Конкурсы, якія адбыліся, з'явіліся магутным стымулам у станаўленні і сцвярджэнні айчыннай музычнай культуры. Яны паказалі таленавітасць нашай моладзі, якая з гонарам прадстаўляе беларускае айчыннае мастацтва на міжнароднай арэне. Так, І.Яраш ста-ла уладальніцай другой прэміі на Міжнародным конкурсе ў Клінгентале, а І.Шэлег — дыпламантам гэтага ж конкурсу. М.Слюсар з'яўляецца дыпламанткай Між-народнага конкурсу ў Маскве. Мінулы год прынёс нам адразу некалькі выдатных перамог на Міжнародным конкурсе «Кубак Поўначы» ў Чарапаўцы. Лаўрэатамі сталі дамрыст М.Марэцкі (І прэмія) і цымбалісткі Л.Рыдлёўская і В.Мішула (І і 2 прэміі).

Зараз у галіне народна-інструментальнага выканання можна назіраць некаторыя процілеглыя з'явы і тэндэнцыі, такія, напрыклад, як распад раней створаных калектываў (прафесійных і аматарскіх) і арганізацыя новых, цікавых ансамбляў. Пры гэтым дзякуючы высокаму майстэрству выканаўцаў новыя калектывы носяць няўстойлівы, зменны характар і ўзнікаюць на сутыкненні процілеглых, здавалася б, зусім не сумяшчальных народна-інструментальнага жанру, жанраў эстрады і джаза.

Вельмі нізкае матэрыяльнае забеспячэнне, незапатрабаванасць талентаў у сваёй краіне прыводзіць да таго, што некаторыя высокапрафесійныя калектывы месцам сваёй творчай дзейнасці выбралі замежжа. Яны зусім не вядомы у Беларусі, але з вялікім поспехам выступаюць у іншых краінах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ